Паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка» Якуб Колас заканчваў пісаць у савецкі час, у 1920-я гг., і гэта было сведчаннем таго, што і ў новых умовах паэт не аслабіў сваёй увагі да невычарпальных крыніц вуснай народнай паэзіі.

Творчасць Якуба Коласа ўсебакова звязана з фальклорам. Класік нашай нацыянальнай літаратуры шчодра чэрпаў са скарбніц мудрасці свайго народа, што з'явілася павучальным прыкладам, мастацкай школай для многіх беларускіх паэтаў і празаікаў.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Беларуская літаратура / склад. У. Адамчык, М. Адамчык. − Мінск: Сучасны літаратар, 2004. − 1008 с.

2. Колас, Я. Паэмы. Апавяданні. Аповесці. Трылогія «На ростанях» / Я. Колас; прадм. М. Мушынскага. – Мінск: Харвест, 2012. − 1168 с.

3. Навуменка, І. Якуб Колас: духоўны воблік героя / І. Навуменка. − Мінск: Беларусь, 1968. − 336 с.

*УДК 821.161.3(092 Я. Купала, М. Багдановіч)*

## ЯНКА КУПАЛА, МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І ПРАЦЭС КУЛЬТУРАТВОРЧАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

**С. В. Грымута**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*
*Гродна, Рэспубліка Беларусь*
*relish5@rambler.ru*

У артыкуле аналізуецца роля нацыянальных класікаў Янкі Купалы і Максіма Багдановіча ў працэсе мастацка-эстэтычнага абнаўлення і ўзбагачэння беларускай паэзіі. Праведзены тыпалагічныя паралелі, вылучана агульнае і адрознае ў творчых канцэпцыях абодвух паэтаў.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; Максім Багдановіч; тыпалогія творчасці; мадэрнізацыя; санет.

## YANKA KUPALA, MAXIM BAGDANOVICH AND THE PROCESS OF CULTURAL MODERNIZATION IN BELARUSIAN POETRY

**S. V. Grymuta**

*Yanka Kupala State University of Grodno*
*Grodno, Republic of Belarus*
*relish5@rambler.ru*

The article analyzes the role of the national classics Yanka Kupala and Maxim Bagdanovich in the process of artistic and aesthetic renewal and enrichment of Belarusian poetry. Typological parallels are drawn, common and distinctive in the creative concepts of both poets are highlighted.

*Key words:* Yanka Kupala; Maxim Bagdanovich; typology of creativity, modernization; sonnet.

Дынаміка жыцця пачатку XX стагоддзя паставіла перад беларускімі творцамі новыя задачы, для вырашэння якіх было неабходным асэнсаванне гістарычнага вопыту і выпрацоўка-пастуляванне кірункаў далейшага развіцця айчыннага мастацтва слова. Арыгінальны мастацкі вопыт Янкі Купалы і Максіма Багдановіча на шляху мадэрнізацыі нацыянальнага пісьменства быў плённым і ў многім сугучным аналагічным працэсам у літаратурах суседніх краін.

Удумлівы падыход паэтаў да распрацоўкі ўласных творчых канцэпцый дазволіў улучыць беларускую літаратуру ў агульнаеўрапейскі кантэкст.

Творчае сталенне паэтаў адбывалася ў цалкам ўнікальны перыяд развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства, які слушна акрэслены даследчыкам П. Васючэнкам як «“нашаніўскі” культурны выбух» [5, с. 47]. Менавіта гэтыя гісторыка-культурныя ўмовы сталі падмуркам для зместавага і фармальна-жанравага ўзбагачэння і абнаўлення беларускай літаратуры. Два паэтычныя зборнікі («Шляхам жыцця» Янкі Купалы і «Вянок» Максіма Багдановіча), якія выйшлі з друку ў 1913 годзе, у многім прадвызначылі аблічча беларускай літаратуры новай эпохі.

Купалаўская ідэйна-эстэтычная канцэпцыя найперш базавалася на гераізацыі гістарычнага мінулага Бацькаўшчыны (мадэрнізацыя праз нацыянальнае адраджэнне), а багдановічаўская – на паэтызацыі прыгожага, Красы (мадэрнізацыя праз эстэтызацыю і еўрапеізацыю). Кампазіцыя зборніка «Шляхам жыцця» Янкі Купалы дэманструе вызначальныя пункты мастацкай канцэпцыі паэта: ад канцэптуальна-праграмнага раздзела «Бацькаўшчыне» (ідэал Айчыны) да натуральна-колазваротнага «Па межах родных» (ідэал красы прыроды) і ўзвышана-лірычнага раздзела «Да яе» (ідэал красы жанчыны і ідэал кахання), да размеркавана-ўпарадкаванага свету «Нашай вёскі» (ідэал хаты, беларускага дому), да пошуку ўласнага месца ў свеце – «Сваім і чужым» (ідэал гармоніі свайго-чужога) і інш.

Глыбінёй думкі і вытанчанасцю формы вызначаецца зборнік «Вянок» Максіма Багдановіча. У ім арганічна ўвасоблены апазнавальныя рысы (дамінанты) паэзіі М. Багдановіча – Краса, хараство, прыгажосць. Ідэал Красы адметна раскрываецца ў вобразе Маці (шматпакутнай Мадонны), у вобразе Беларусі (дзе арганічна паяднаны з’ява Красы і з’ява Беларусі), у вобразах роднай прыроды і таямнічага «зачарованага царства» і інш. Краса Духу і краса Розуму для Багдановіча – паняцці не ўзаемавыключальныя, а ўзаемадапаўняльныя: «Жыві і цэльнасці шукай, // Аб шыраце духоўнай дбай» [2, с. 121].

Творчы патэнцыял паэтаў не абмяжоўваўся акрэсленымі дамінантамі мастацкіх канцэпцый. У паэзіі М. Багдановіча выразна гучаць грамадзянскія матывы (заангажаванасць у праблемы будучыні, тэма лёсу Беларусі). Роздум паэта знайшоў сваё арганічнае ўвасабленне ў раздзеле «Думы» і часткова ў нізцы «Згукі Бацькаўшчыны». Сярод сумневу і вечнага плачу па старонцы, сярод «гадзін панурых, нудных, шэрых» М. Багдановіч заклікае плыць-ісці «проці цячэння вады», кіруючыся прыкладам дзядоў. Краса нескаронага духу і вера ў будучыню («Хай не відаць яго... а ўсё ж ткі ён не згас!» [2, с. 109]) – дамінанты паэтавага аптымізму.

Янка Купала і Максім Багдановіч абнаўлялі нацыянальную паэтычную традыцыю праз засваенне і трансфармацыю набыткаў еўрапейскіх мастацкіх кірункаў. Працы У. Конана, У. Гніламёдава, П. Васючэнкі, І. Багдановіч, Л. Тарасюк, Е. Лявонавай, Г. Адамовіч і іншых даследчыкаў прысвечаны аналізу іншанацыянальных ўплываў на беларускую літаратуру. Эстэтыка сімвалізму знайшла сваё арыгінальнае ўвасабленне ў многіх вершах (зборнікі «Гусляр» і «Шляхам жыцця») і паэмах Янкі Купалы. Скразнымі вобразамі-сімваламі творчасці паэта выступаюць доля, сон, хата, пясняр, завіруха, курган, крыж і інш. Грунтоўны літаратуразнаўчы аналіз драматычных паэм «Сон на кургане» і «Адвечная песня» і некаторых іншых твораў Янкі Купалы прадстаўлены П. Васючэнкам у манаграфіі «Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання», дзе доказна сцвярджаецца ўздзеянне сімвалісцкай паэтыкі на мастацкую манеру класіка нашай літаратуры.

Гераізацыя і ідэалізацыя мінулага (паэма «На куццю»), рамантызацыя вобраза паэта-прарока (паэма «Гусляр», вершы са зборнікаў «Гусляр», «Шляхам жыцця»), стварэнне вобразаў моцных герояў-бунтароў (паэмы «Магіла льва», «Бандароўна») сталі асновай для даследавання праяў неарамантызму ў творчай спадчыне паэта. Купалаўскі неарамантызм – адметны, «звязаны з працягам распрацоўкі рамантычнага ідэала свабоды: але не ў духу адчужанасці і ўцёкаў ад рэчаіснасці рамантычнага героя з яго ўнутраным суб’ектыўным светам, а ў духу нацыянальна-вызваленчай барацьбы» [1, с. 170].

Вопыт рускага сімвалізму (асваенне ўрбаністычнай і эратычнай тэматыкі, зварот да скарбніц народнай міфалогіі, аб’яднанне вершаў у цыклы, пошук у галіне паэтычнай формы і інш.) быў творча асэнсаваны і па-наватарску рэпрэзентаваны М. Багдановічам ва ўласнай паэзіі.

Нізка «Места» са зборніка «Вянок» адкрыла ўрбаністычную тэму ў беларускай паэзіі. Паэтызацыя Вільні, вулкі якой «зіяюць і гулка грымяць» [2, с. 96], і новай неўтаймавальнай гарадской стыхіі ўвогуле, «дзе чутны разам стогн і смех!» [2, с. 99], пазначаны пячаткай першапраходца. Нягледзячы на тое, што ў распрацоўцы ўрбаністычнай тэматыкі М. Багдановіч арыентаваўся на здабыткі рускіх сімвалістаў (А. Блока, В. Брусава, Ю. Балтрушайціса), увасабленне горада беларускім паэтам мае выразныя рысы наватарства.

Янка Купала і Максім Багдановіч ўсведамлялі неабходнасць пашырэння жанравага дыяпазону беларускай паэзіі і засваення новых вершаваных форм. Пошук у галіне вершаванай формы абумовіў зварот паэтаў да жанру санета. Верш «Жніво» (1910) Янкі Купалы лічыцца першым прыкладам беларускамоўнага санета ў нацыянальнай літаратуры. Паводле характарыстыкі даследчыка У. Сенькаўца, паэт «распрацоўваў форму польскага рамантычнага санета, дапаўняючы яе элементамі беларускай народнай творчасці. Ён вольна адносіўся да многіх кананічных патрабаванняў: ігнараваў забарону на паўтарэнне кожнага знамянальнага слова болей за адзін раз <…> – выкарыстоўваў прыём рэфрэннага паўтору слоў і нават цэлых словазлучэнняў з мэтай надання санету больш напружанага эмацыянальнага гучання, засяроджваючы ўвагу чытача на асноўнай ідэі твора. <…> Янка Купала надае санету шырокае патрыятычна-грамадзянскае гучанне (“Жніво”, “Запушчаны палац” і інш.)» [6, с. 56].

Максім Багдановіч даў тэарэтычнае абгрунтаванне згаданаму жанру ў артыкуле «Санет» і практычна ўвасобіў ва ўласнай творчасці. Ён сцвярджаў неабходнасць дакладнага захавання класічнага канону пры стварэнні санетаў: «Значыцца, санетная форма распадаецца на дзве асобныя часці, што вымагае і ад зместу кожнай з іх як скончанасці, так і незалежнасці. <…> Павэдлуг гэтага ў першых васьмі строчках развіваецца тэма санету, а ў астатнім – заключэнне да яе; ставіцца пытанне і даецца адказ; малюецца абразок і выкладаецца паясненне к яму» [3, с. 194]. Арыгінальны санетарый М. Багдановіча колькасна невялікі, аднак у ім знайшлі сваё натуральнае ўвасабленне многія актуальныя тэмы і праблемы (тэма кахання і ўрбаністычная тэматыка, праблема творчасці і Красы мастацтва, філасофская і грамадзянская праблематыка).

Нізка вершаў «Старая спадчына» М. Багдановіча выразна прадэманстравала, што такія класічныя вершаваныя формы, як трыялет, рандо, тэрцыны і інш., могуць быць арганічна засвоены беларускай паэзіяй: «…маючы на ўвазе не толькі іх красу, не толькі палепшанне версіфікатарскай снароўкі пры працы над імі, але і жаданнем прышчапіць да беларускай пісьменнасці здабыткі чужаземнага паэтычнага труда, памагчы атрымаць ёй больш еўрапейскі выгляд. Апрыч таго, фактам з’яўлення іх хацеў я давесці здатнасць нашай мовы да самых строгіх вымог вяршоўнай формы…» [4, с. 244]. Трыялет «Мне доўгае расстанне з Вамі…» з’яўляецца адным з выдатных узораў паэтычнага майстэрства М. Багдановіча. Захоўваючы класічную будову згаданай вершаванай формы (паўтор першага, чацвёртага і сёмага радкоў, а таксама другога і восьмага), паэт раскрывае тэму пакут закаханага праз нетыповае параўнанне і традыцыйную апазіцыю белага-чорнага:

Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.
Чаму ж нядобры час прынёс
Мне доўгае расстанне з Вамі?
Я паблядneў ад горкіх слёз
І трыялет пачаў славамі:
Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос [2, с. 255].

Шматлікія мастацкія пошукі айчынных літаратараў патрабавалі глыбокага крытычнага асэнсавання. Паслядоўны аналіз творчай эвалюцыі беларускіх пісьменнікаў прадстаўлены М. Багдановічам-крытыкам у праграмных артыкулах «Глыбы і слаі», «Забыты шлях», «За тры гады. Агляд беларускай краснай пісьменнасці», «Белорусское возрождение» і інш. Пра дасягненні Янкі Купалы не толькі ў галіне зместу, але і ў галіне формы, рытму, рыфмы, што яскрава

выявілася ў кнізе «Шляхам жыцця», М. Багдановіч пісаў: «З радасцю бачым, што талент Купалы развіваецца. <…> Не толькі нядоля нашай вёскі ды нацыянальныя справы Беларушчыны цікавяць яго. Ужо і краса прыроды і краса кахання знайшлі сабе месца ў яго творах. <…> Глаўнае ж тое, што ўсё гэта ў многіх вершах Купалы зроблена надзвычайна пекна, з праўдзівым уменнем ды з вялікім пад'ёмам пачуцця. Часта-густа спатыкаецца прыгожая будова верша, цікавая па спляценню строк, расстаноўцы рыфм, ужыванню цэзур; разнастайнасць рытмаў з іх усягдашняй лёгкасцю ды моцным разгонам; краса, свежасць і паўназычнасць рыфм, звінячых не толькі на канцы, але і пасярэдзіне строк; гучнасць слоў, падабраных да верша, і шмат што іншае» [3, с. 223–224]. Літаратурна-мастацкая крытыка дапамагала засведчыць прагрэс і выявіць недахопы нацыянальнага прыгожага пісьменства.

У мастацкіх канцэпцыях Янкі Купалы і М. Багдановіча актуалізаваліся задачы, якія стаялі перад тагачаснай беларускай літаратурай: арыентацыя на дасягненні еўрапейскага прыгожага пісьменства і іх адаптацыя да нацыянальнай глебы (сімвалізм, неарамантызм, імпрэсіянізм), неабходнасць пашырэння праблемна-тэматычнага кола айчыннай паэзіі (распрацоўка філасофскай, урбаністычнай і эратычнай тэматыкі і інш.), яе жанрава-фармальнае ўзбагачэнне (асваенне класічных вершаваных форм і памераў: санета, рандо, тэрцын, трыялета, пентаметра і інш.; разнастайнасць паэмнага жанру), крытычнае асэнсаванне зробленага. Мэтанакіраваная рэалізацыя пастаўленых задач беларускімі класікамі ва ўласнай творчасці была скіравана на мадэрнізацыю нацыянальнай паэтычнай традыцыі.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя: Беларус. паэзія на хвалі нац. адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 387 с.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 751 с.
3. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 2: Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 600 с.
4. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 3: Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці. – 461 с.
5. Васючэнка, П. В. Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм / П. В. Васючэнка; навук. рэд. В. П. Жураўлёў. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: МДЛУ, 2016. – 200 с.
6. Сенькавец, У. А. Беларускі санет: ля вытокаў жанру: манагр. / У. А. Сенькавец; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2007. – 178 с.

*УДК 821.161.3.09(092 Я. Колас)*

# ВОБРАЗ ЮНАКА Ў АПАВЯДАННІ ЯКУБА КОЛАСА «НОЧ, КАЛІ ПАПАРАЦЬ ЦВІЦЕ» СА ЗБОРНІКА «КАЗКІ ЖЫЦЦЯ»

**А. А. Дзенісевіч**

*ДУА «Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва»*
*Магілёў, Рэспубліка Беларусь*
*gelya.denisevich@mail.ru*

У артыкуле пададзены кароткі аналіз вобраза Юнака з апавядання Якуба Коласа «Ноч, калі папараць цвіце». Народная творчасць разглядаецца як спосаб спазнання рэальнага жыцця. У творы не толькі раскрываецца вобраз сябра як паплечніка, які падзяляе думкі, меркаванні, ідэі, але паралельна паказваецца роля літаратуры ў жыцці народа.

*Ключавыя словы:* Якуб Колас; Янка Купала; апавяданне; вусная народная творчасць; Юнак; беларускі народ.